The Byelorussian Times

ЧАС

Двумоўны беларускі часапіс у З.Ш.А.

No.36, Vol.7, USPS 345–170 **March 1982** **9-06 Parsons Blvd., Flushing, N.Y. 11357** **Price $1.35**

On the 64-th Anniversary of Proclamation of the Byelorussian National Republic

On March 25, 1982, the 64-th anniversary of the proclamation of the Byelorussian National Republic in 1918 and the re-establishment of Byelorussian independence, many U.S. Congressmen rose in the House of Representatives to speak on behalf of the Byelorussian nation and to commemorate the anniversary. Among them was Congressman Mario Biaggi from New York who for many years has been a good friend of the Byelorussian community in the New York metropolitan area. This year he was instrumental in inviting Bishop Iziaslav of the Byelorussian Autocephalic Orthodox Church to Washington to read an invocation and a prayer for both the Byelorussian and American peoples at the Congressional session of March 25, 1982. While the text of the prayer is printed elsewhere in this issue of the *Byelorussian Times*, most of the congressional speeches were still unavailable at press time. Therefore, the *Byelorussian Times* includes only a very eloquent speech by Congressman J. Derwinski of Chicago, delivered in the chamber of the House of Representatives on March 25, 1982:

SIXTY-FOURTH ANNIVERSARY OF BYELORUSSIAN INDEPENDENCE

HON. EDWARD J. DERWINSKI

OF ILLINOIS

IN THE HOUSE OF REPRESENTATIVES

Thursday, March 25, 1982

"...Throughout their history, the Byelorussian people have transmitted from generation to generation their national identity through their cultural achievements, language, and rich heritage. The knowledge of what it is to be free and the determination for this renewed freedom continues to inspire these valiant people in their dreams of re-establishing their homeland as an independent nation.

"It is a real tragedy that the Byelorussian people, whose heritage is so rich in the tradition of democracy, live under the oppressive rule of the Soviet Government. It is also unfortunate that these people are not more intensely served by the Voice of America, Radio Free Europe, and Radio Liberty broadcasts. **The Byelorussians are not allowed to learn of the nature of Soviet expansionism throughout the world and the vitality of their respective cultural heritages in the United States because for years the Byelorussians in the Soviet Union have not had any VOA broadcasts in their own language.**

"I have introduced a resolution calling for the extension and improvement of the quality and quantity of programs in foreign languages of the VOA, Radio Liberty, and Radio Free Europe, which will increase their impact and effectiveness. Our broadcasts to the Soviet bloc are the principal communication link between the United States and the more than 330 million people within the area, and these radios are our most important nonlethal weapons in confrontation with the Soviet Government.

"As we commemorate this anniversary of Bielarus independence, we highlight this day as a symbol of the national aspirations of the Byelorussian people for their sovereignty and self-determination. We also commend and acknowledge the courage of the Byelorussian people. This anniversary serves as a reminder that the spirit of freedom continues to burn in the hearts of the Byelorussian people despite Communist oppression. I trust that we can reassure those brave people whose human rights and cultural heritage are held captive, that they will continue to receive our encouragement for their ultimate goal of self-determination."

Afghanistan Day Proclaimed

On March 10, 1982, leaders of Congress, administration officials, representatives from many free nations of the world and nationality leaders of nations subjugated by Communism joined President Ronald Reagan in the White House for a special ceremony at which the President sig ned a joint congressional resolution designating March 21, 1982, as "Afghanistan Day" in the United States.

The publisher of the *Byelorussian Times*, Dr. R. Horoshko, was invited to the ceremony attended by about two hundred other nationality leaders and publishers of ethnic newspapers. In addition, participants included: Senators Clairborne Pell and Arlen Specter; Representatives William Broomfield, James Courter, Elliot Levitas, Thomas Petri, Joel Pritchard and Donald Ritter; foreign parliamentarians Dr. Egon Klepsch (West Germany), Carlo Ripa di Meana (Italy), Nicholas Lord Bethell (England), Gerard Israel (Algeria), Ludwig Steiner (Austria)· Mrs. Hiroko Hayashi (Japan), Masao Endo (Japan), Moses Keino (Kenya), Peter Mungai (Kenya), Harley Mitchell (Panama), Arnulfo Escalono (Panama), Cesar Perreira (Panama), Charoen Pongpanich (Thailand) and Bandit Workanbancha (Thailand).

The ceremony was opened at 11:30 AM by William Clark and opening remarks were made by Secretary William Rogers who heads the U.S. National Afghanistan Day Committee. Following brief remarks by Vice-President George Bush, a statement was read by Dr. Egon Klepsch, Vice-President of the European Parliament which is responsible for the world-wide effort designating March 21 as "Afghanistan Day". Finally, at about noon, President Reagan delivered a short speech and signed the proclamation. All speakers in various ways condemned the Soviet Union for the present plight of the Afghan Nation and spoke about problems of dealing with more than three million refugees from Afghanistan. All praised the Afghan people for their valiant struggle against the Russian invasion of their country. President Reagan said: "The source of aggression in Afghanistan is Moscow and the world will not forget the brave Afghan people as it has not forgotten the peoples of the Captive Nations."

FOREIGN POLICY BRIEFING AT THE U.S. DEPARTMENT OF STATE

Following the signing of the "Afghanistan Day" proclamation by President Reagan the State Department hosted a foreign policy briefing by senior U.S. policy officials for the invited guests.

At 2:30 PM on March 10, 1982, Ambassador Gerald Helman welcomed the guests to the State Department and deferred the briefing to specialists in:

(1) **East-West Relations**, Ambassador Walter Stoessel, Deputy Secretary of State;

(2) **U.S. Policy in Eastern Europe**, John D. Scanlan, Deputy Assistant Secretary, Bureau of European Affairs;

(3) **U.S. Policy in South Asia**, Peter Constable, Acting Assistant Secretary for Near Eastern and South Asian Affairs;

(4) **U.S. Policy in East Asia**, Ambassador John H. Holdridge, Assistant Secretary for East Asian & Pacific Affairs.

Ambassador Stoessel noted some of the principal U.S. foreign policy goals which include: (1) world peace, (2) prevention of the export of revolutions, (3) better relations with allies in Europe and elsewhere, and other items. He also stated the importance of U.S. relations with the USSR which now have become more difficult in view of the Soviet involvement in Lybia, Afghanistan, Cuba, Poland and elsewhere. However, according to Ambassador Stoessel, the "U.S. does not seek a confrontation with the USSR".

Assistant Secretary Scanlan repeatedly emphasized that the U.S. attempts to conduct its foreign policy in a "responsible manner" even though the Soviets, according to Scanlan, "do not act responsibly". He further noted that "restraint and reciprocity and not open-ended confrontation with the USSR" are key U.S. policy elements and that the U.S. wants a "stable and constructive" relationship with the USSR and that this is the "only responsible approach". As for Moscow, Scanlan can only "hope for a serious approach by the Soviets."

A number of questions were asked by the guests, but the one which apparently created the most interest if judged by a spontaneous murmur heard throughout the auditorium was one by Dr. R. Horoshko of *The Byelorussian Times*: "Responsible policy and responsible behavior sound very well, but the reality is that Moscow has never paid any attention to it and probably never will. There is a view among many that the only thing that matters in the end and the only way nuclear war can be prevented is by dismemberment of the USSR before World War III arrives and that the U.S. must play a vital role in such dismemberment of the Soviet Union (for its own safety). So, what is the State Department's view concerning dismemberment of the Soviet Union?" A few other similar but less direct questions followed and the response to these was, that dismemberment of the USSR means war and, perhaps more significantly, the participants were lead to believe that this is all that can be said in public.

With respect to the present situation in Poland it was said that the U.S. will not interfere in Poland's internal affairs. On Afghanistan, the State Department sees no favorable solution to the problems facing Moscow in its continued occupation of Afghanistan. The use of Soviet chemical and biological weapons was also discussed, but in general nothing new was said.

The question of freedom for Byelorussia leads to the "forbidden zone" in the State Department, namely the publicly proclaimed policy of non-interference in the internal affairs of the USSR. Whatever covert policy there might be in this connection, if any, it is not known. In any case, the exchange of opinions between the State Department and the nationality leaders should be viewed as useful, and it may be that the State Department learned more from its guests than the guests learned from the State Department.

ПЯТАЯ СУСТРЭЧА БЕЛАРУСАЎ АЎСТРАЛІІ

Выканаўчы Камітэт Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі падае да ведама ўсіх Беларусаў на эміграцыі, што Пятая Сустрэча Беларусаў Аўстраліі адбудзецца ў Сыднэі ад 29-XII-1982 году да 2-I-1983 году.

Дакладныя інфармацыі й праграма Сустрэчы будуць паданыя пазьней.

Выканаўчы Камітэт
Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў
у Аўстраліі

CHURCH LITIGATION

By Valentine Horoshko

During the course of litigation in the Byelorussian Autocephalic Orthodox Church (BAOC) a theory has been advanced by Archbishop Mikalay and his adherents that a clergyman may not litigate in civil courts. According to this view litigation by clergy violates canon law and any clergyman who seeks redress of a grievance in a civil court loses his clerical status. This theory has been directed primarily against Bishop Iziaslav (John Brucky) for having commenced civil action against Rev. Alexander Janowski.

Unfortunately, the above-described view is not supported by precedent or reality. It is not the intention of the author to delve into the interpretation of canons – certain rules which were adopted principally at seven ecumenical councils from the fourth to the eight centuries – a matter better reserved to doctors of theology of which there are all too few in the BAOC and apparently none in Archbishop Mikalay's camp. Certainly, mere bland and unsupported statements that certain conduct violates the canons is of little probative value. The supporters of this view have cited no precedent or authorities other than simplistic readings of church canons promulgated over a millenium ago in a different milieu where the clergy's decisions could be enforced directly by civil authorities. For some time, however, ecclesiastical decisions have had no authoritative effect especially in western democracies such as the United States where only civil courts possess coercive authority.

Consequently, it may be enlightening to consider how other churches which subscribe to the canons, rules and regulations of the Holy Ecumenical Apostolic Orthodox Church (Eastern Orthodox Church) view the canonical questions of litigation by its clergy. It may be noted that certain critics consider the BAOC "uncanonical" – a term which has been loosely utilized by various groups with apparently no knowledge what is "canonical" or "uncanonical". Nevertheless, for purposes of this discussion references will be made to the so-called "canonical" churches.

There is no question that the Serbian Orthodox Church is a canonical Orthodox church. It has its own Patriarch and is recognized by the Patriarch of Constantinople. However, the Serbian Orthodox Church has been involved in considerable litigation. In fact, the Serbian litigation has transcended national frontiers and involved the highest ecclesiastical authorities. For example, Bishop Dionisije Milivojevich filed suit in the Circuit Court of Lake County, Illinois on July 26, 1963 seeking to enjoin an adverse Serbian group from interfering with the assets of certain religious corporations under the control of Dionisije and his supporters. On the other hand, a number of illustrious clergy filed a civil suit against Dionisije: Bishops Firmilian Ocokoljich and Gregory Udicki as well as the Serbian Eastern Orthodox Diocese for the United States and Canada.

In the Serbian litigation which spanned some twenty years, the Holy Assembly of Bishops of the Serbian Patriarch (analogous to the Council of Bishops in the BAOC) deposed Bishop Dionisije as Bishop of the Serbian Diocese for the United States and Canada. Dionisije did not submit to the Assembly's decision, so the newly appointed bishops commenced action in a civil court in Illinois to enforce the Holy Assembly's decision. So bishops of an esteemed canonical Eastern Orthodox Church were suing bishops in a civil court. There were no contentions that civil suits by the clergy were breaches of canons as Archbishop Mikalay's supporters profess. In fact, the Catholic Bishop of Chicago filed a brief as **amicus curiae** for one of the Serbian bishops. Simply put, the highest ecclesiastical authority in the Serbian Church rendered its decision that a certain bishop had been deposed but that determination required a civil court's coercive authority for implementation.

Secondly, consider the Russian Orthodox Church which is subject to the Moscow Patriarch. It is a recognized "canonical" church although some may dislike its political relationship with its Government. In the well-known case of **Kedroff v. St. Nicholas Cathedral**, 344 U.S. 94 (1952), a property dispute between the Moscow Patriarch and the Metropolia, the principal litigants were the clergy. Yet, again, no one contended that clergymen cannot sue in a civil court. Furtheremore, in the case involving the **St. Michael and Archangel Russian Orthodox Greek Catholic Church** (259 A. 2d. 862 (1969)), a Pennsylvania dispute similar to the one in **Kedroff,** the principal litigants were the clergy.

More recently in the case of the **Russian Church of Our Lady of Kazan v. Dunkel,** 33 N.Y. 2d. 456 (1974), the lawsuit involved:

(1) The Russian Orthodox Greek Catholic Church of America (Metropolia);

(2) Synod of Bishops of the Russian Orthodox Church Outside of Russia (Russian Church in Exile); and

(3) The Orthodox Church in America (Successor to the Metropolia).

In that action the principal expert witness for the Russian Church in Exile was Father Grabbe, a well-known and respected authority on the Eastern Orthodox Church. Again, there were no claims that civil lawsuits were contrary to the canons.

Closer to home in the BAOC, in 1968 there was a civil action in Brooklyn, New York, involving Archbishop Vasili and Rev. George Obremski. The Archbishop was prevented from entry to the Cathedral by Rev. Obremski's supporters – a situation analogous to the pending lawsuit between Rev. John Brucky and Rev. Alexander Janowski in New Jersey.. Strangely, many of the most vocal disseminators of the theory that a clergyman cannot be involved in a civil lawsuit, were the most vehement supporters of Archbishop Vasil's lawsuit against Obremski and his supporters in 1968. In fact, it is even more strange and perplexing that Archbishop Mikalay was the principal witness in behalf of Archbishop Vasili in a civil court, and there is no record that Archbishop Mikalay considered a cleric's involvement in a lawsuit as anticanonical. Surely the canons which were promulgated more than one thousand years ago have not changed in the brief interval of time since 1968.

Upon judicious reflection the assertions propounded by Archbishop Mikalay and his supporters that civil suits by clerics violate the canons are without basis. Canons cannot be simply read and given a glib interpretation of their meaning. On the contrary, doctors of theology who have devoted their lives to the study of canons cannot agree upon their interpretation which requires consideration of learned treatises as well as knowledge of Greek and other languages. It is difficult to conceive of a theological authority in Archbishop Mikalay's faction who would even meet part of these criteria. Certainly, the clergy of some of the most illustrious of "canonical" Eastern Orthodox Churches have been involved in civil law suits for which they received praise not approbation.

* * *

The author, a New York City attorney, is counsel to the Consistory of the BAOC and represented St. Cyril's of Turov Cathedral, New York, in its successful lawsuit against a faction of dissidents.

Рэдакцыйная Калегія газэты „БЕЛАРУСКІ ЧАС"
шчыра вітае ўсё Духавенства БАПЦ,
ўсіх сваіх чытачоў, усіх беларусаў у чужых краінах съвету
прабываючых, ды ўвесь Беларускі Народ на Бацькаўшчыне,
зъ ВЯЛІКАДНЕМ ХРЫСТОВАГА ЎВАСКРАСЕНЬНЯ.
ХРЫСТОС УВАСКРОС!

BULAK-BALACHOVIC AND HIS STAMPS

By William Lesh

The story of Stanislav Nikadzimavič Bulak-Balachovič, a Major General in the service of the Byelorussian National Republic, under whose command a number of Byelorussian postage stamps were issued, begins in August 1914, when he had volunteered for service in the Russian Czarist Army. Bulak-Balachovič had distinguished himself for bravery in the Baltic region and by March 3, 1918 (the Treaty of Brest-Litovsk), had risen to a captain.

After the Treaty was signed, Bulak-Balachovič secured permission from the Soviets to form a regiment near Luga which was organized in April, 1918. In October, 1918, with the help of Captain Neff and his Northern Corps, he retired to Pskov with more than 1,000 men.

When the German front collapsed in the north, the now Colonel Bulak-Balachovič, served under General Alexander Pavlovich Rodzianko, a Russian calvary officer, who fought on the Estonian front from February, 1919. Near the end of February B.-Balachovič raided Gdov and held it for several days. Rodzianko and his troops were forced to retreat from Pskov in May. The Estonians freed Pskov on May 30, 1919, and Bulak-Balachovič was installed as a military commander of the area.

On June 15, 1919, General Nicholas N. Yudenich was given command of the Russian forces formerly fighting with the Estonian Army. On August 23 Bulak-Balachovič was removed as commander of the Pskov region and on August 27 the Soviets occupied Pskov. On September 28 Yudenich's North-West Army began its assault on Petrograd and on October first Bulak-Balachovič cut the Soviet lines at Bulata. On October 12 Yamburg was in the 'White' hands and Pskov was recaptured on the fifteenth. But, at this time, Bulak-Balachovič was no longer with the army – evidently bad blood existed between him and Yudenich. By late Novenber the North-Western Front had collapsed.

About six weeks later, the story goes, Bulak-Baluchovič had kidnapped Yudenich and was holding him for ransom, but Yudenich was saved by the Estonians to whom he owed money.

After this episode, Bulak-Balachovič lived in Reval, Estonia, and there he entered into the service of the Byelorussian National Republic as a Major General. In late December Bulak-Balachovič had over 1,000 men on the Ostrov Front with others on the Pskov Front. In addition, Count Pahlen, commander of the First Division of the Russian North-West Army, promised to join Bulak-Balachovič when funds became available. Around February, 1920, Bulak-Balachovič's forces were centered around the towns of Aluksne and Gulbene in Latvia.

Also at about this time in 1920, there were issued a very handsome series of stamps of the Army Corps of the Byelorussian National Republic under Major General Bulak-Balachovič. A complete set consisted of 5 values: 5, 10, 15, 50 Kop. and 1 (Ost) Ruble. (1 Ost Ruble = 2 Mk.).

A Byelorussian military and diplomatic mission existed at that time in Latvia and Estonia as evidenced by the following document which appeared in the Baltic philatelic publication "Der Baltische Philatelist", p.13–14, in April, 1920:

(continued on page 6)

The Byelorussian Times
ЧАС
Двумоўны беларускі часапіс у З.Ш.А.
USPS 345–170
9–06 Parsons Blvd.
Flushing, N.Y. 11357
U.S.A.
A Byelorussian Newspaper
Published bimonthly in January, March, May, July, September and November.
Dr. Roger Horoshko, Publisher
Annual Subscription
$8 in U.S. currency
$10 Canadian, £6 English
Postmaster:
Send address changes to the
BYELORUSSIAN TIMES
Box 141, Whitestone, N.Y. 11357
Second Class Postage Paid at Flushing, N.Y. 11355
„ЧАС"
Двумоўная
беларуская газэта
Выходзіць 6 разоў на год у студзені, сакавіку, травені, ліпені, верасьні й лістападзе.
Др. Р. Гарошка, Выдавец
Гадавая Падпіска
8 амэрыканскіх даляраў
10 канадыйскіх даляраў
6 ангельскіх фунтаў

Anti-Byelorussian clique remains in control at VA

On March 23, 1982, James Conkling resigned as director of the Voice of America (VA). Three days earlier Philip Nikolaidis, assistant director of the VA, tendered his resignation. Both resigned in face of strong opposition from the entrenched bureaucracy to their efforts to strenghten the propoganda elements of the VA broadcasts which is also the desire of President Reagan. The opposition consisting mainly of tenured civil servants who cannot be fired, charged that the "norms of journalistic ethic" would be violated by an increased propoganda effort.

This is but one example of civil servants having greater power than the President or Congress in deciding U.S. policy. Indeed, Mr. Conkling has found what every junior Congressman quickly learns that it is difficult to fight the entrenched bureaucracy.

It is this entrenched bureaucracy which permeates the VA, the State Department and other U.S. Government agencies that devoutly adheres to the unwritten commandment of "non-interference in the internal affairs of the USSR."

The initiation of Byelorussian-language programs by the VA would be construed by many as "interference in the internal affairs of the USSR", irrespective of the content of the programing, because it would, once again, indicate that the U.S. opposes Byelorussia's incorporation into the Soviet Union. For this reason Byelorussian-language programs are forbidden at the VA and will probably continue to be forbidden as long as the present anti-Byelorussian clique remains in control of the VA.

АРХІПАСТЫРСКАЕ ВЯЛІКОДНАЕ ПАСЛАНЬНЕ
Сьвячэннага Сабору Япіскапаў
Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы

„Я ёсьць уваскрасеньне й жыцьцё; хто веруе ў Мяне хоць і памрэ, жыць будзе". (Ін. XI,25)

ХРЫСТОС УВАСКРОС

Любыя й Дарагія Браты й Сёстры!

Ізноў мы дачакаліся Сьветлага Хрыстовага Ўваскрасеньня, калі неба й зямля радуюцца й весяляцца. Ангелы й людзі натхнёна пяюць, славячы Ўваскросшага Госпада. Пасьля нявымоўнае пакуты Яго на Крыжы, прыйшоў гэты Вялікі Дзень – Хрыстос Уваскрос! Уваскрос згодна слоў прарокаў і як гаварыў Сам, ды як апавясьціў Ангел Жонам Міраносіцам „Ня бойцеся! Я ведаю, што шукаеце Ісуса, Яго няма тут. Ён Уваскрос! Як і сказаў. Хадзеце паглядзеце месца, дзе ляжаў Госпад." (Мц. 28,6)

ХРЫСТОС УВАСКРОС! Пасьля цярпеньняў, зьдзекаў, цемры й сьмерці, прыйшоў дзень Трыўмфу, Сьвятла, Славы, бо Божую Праўду ня можна пахаваць у гробу, бо Яна несьмяротная, Яна вечная! Шмат разоў ужо сілы зьлядня ды неразумныя людзі таптালі праўду, хацелі яе пахаваць, яле яна заўсёды ўваскрасала ў зьяньні Нябеснае Славы, аб чым і цяпер на Вялікдзень прыпамінаецца нам аб гэтым Хрыстовым Цудзе над Цудамі.

Уваскрасеньне Хрыстовае ёсьць найгалаўнейшаю падзеяй з зямнога жыцьця Госпада. Яно ёсьць асноваю нашае веры й доказам нашага будучага жыцьця. Таму Праваслаўная Царква й сьвяткуе асабліва ўрачыста дзень Уваскрасеньня успамінаючы тыя вялікія й слаўныя падзеі ў прыгожых царкоўных песьнях у якіх асабліва выразна раскрываецца ўся важнасьць і значэньне Ўваскрасеньня Хрыста.

Надзвычайная радасьць ахоплівае сэрцы веруючых хрысьціянаў у гэты Вялікі Дзень, „што яго стварыў Госпад". Ды як-жа не радавацца, калі „нябёсы весяляцца й зямля радуецца", калі Царква заклікае ўсё тварэньне да духовае ўрачыстасьці!„І ніхто не пазбаўлены тае радасьці: ні той, хто згодна слоў сьвятога Яна Залатавуснага прыйшоў а шостай гадзіне, ці той хто прыйшоў а гадзіне дзявятай, або а гадзіне адзінаццатай, бо кожны можа ўвайсьці ў радасьць Госпада, Які ёсьць Справядлівым Судзьдзёю, Абаронцам удоваў, сіратаў і пакрыўджаных. І толькі Ён можа ўстанавіць Сваю Праўду на зямлі. І надыйдзе час, калі пабожныя будуць цешыцца з Славы Ягонай і будуць славіць імя Яго". (Псальм 149,5).

Аднак было-б яшчэ памылкова думаць аб тым, што заклік да зьдзейсьненьня Валадарства Божага на зямлі сёньня ўжо стаўся жывою рэчаіснасьцю й ёсьць дакананым фактам. Такая думка супярэчала-б таму, што дзеецца ў сучаснасьці ў сьвеце, а навука Хрыстовая прасякнута зусім іншаю мэтаю для людзкага жыцьця. Любоў, мір і радасьць і ўзаемнае змаганьне супроць ненавісьці ёсьць аснаўною мэтаю Хрыстовае навукі.

Любоў, супакой і радасьць павінны ўваскрэснуць, бо Хрыстос Уваскрос! Таму Сьвята Ўваскрасеньне Хрыста павінна для нас быць ня толькі радасным успамінам пра дакананьне Госпадам нашым Ісусам Хрыстом справы нашага спасеньня, але й вечным заклікам да самадасканаласьці, праз што толькі можа ўзрадавацца нашая душа, прасьвятліцца розумам і стацца здатняю быць храмам Сьвятога Духа!

І калі прарокі, натхнёныя Духам Сьвятым, за тысячы год прад Раством Хрыстовым, прадбачылі гэтую вялікую перамогу Хрыста над сьмерцьцю й радасна ўсклікалі: „Сьмерць, дзе тваё джала? Пекла, дзе твая перамога?" (Ос. 13,14). Дык як-жа нам цяпер не радавацца, калі Хрыстос і сьмерць і пекла перамог (зьнішчыў), а нам жыцьцё вечнае даравў.

Таму ад імя нашае роднае Маці Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы й мы заклікаем Вас: Радуйцеся, й дзякуйце Яму Хрысту Богу й Спасу нашаму за Ягоную бязьмерную міласьць і Ласку да нас.

Радуйцеся й весяліцеся так, як радаваліся нашыя продкі ў часе Вялікодных Сьвят, як радаваліся ўдзельнікі аднаўленьня нашае роднае Царквы на выгнаньню, сярод іх ня было ніякае варожасьці, а была толькі любоў Божая, Хрыстовая, Нябесная!

З такімі нашымі разважаньнямі й маліто́ўнымі пажаданьнямі сардэчна вітаем Вас, Усячэсныя Айцы, любыя й Дарагія Браты й Сёстры й увесь Беларускі Народ з Вялікім і Радасным Сьвятам – Уваскрасеньнем Хрыстовым – Вялікаднем!

Ласка, згода, супакой і любоў Уваскросшага Госпада нашага Ісуса Хрыста й лучнасьць Сьвятога Духа няхай будзе з усімі Вамі цяпер і ўсячасна й павек вякоў. Амін.

Пакорны ў Богу +Мітрапаліт Андрэй
Пакорны ў Богу +Япіскап Ізяслаў

Вялікдзень, Лета Божага 1982, месяца сакавіка.

РАЗБОР ЦАРКОЎНЫХ ГРОШАЎ

14-га й 21-га лютага, 1982 году, бруклінская група адшчэпнікаў якая прагарала царкоўны суд яшчэ ў жнівені 1981 году, передала царкоўныя кнігі Парафіяльнай Радзе Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне. Передача адбылася шэсьць месяцаў пасьля заканчэньня судовай справы й то толькі пасьля пагрозы новым судом за царкоўныя кнігі.

Адзін пераданы фінансавы дакумант, каторы друкуецца ніжэй, паказвае як адшчэпнікі разбіралі царкоўныя грошы:

ВЫДАТКІ

#1, 4/VI/81, выдана адвакату $1,000
#2, 22/VI/81, выдана адвакату $1,000
#3, 25/VI/81, Р. Станкевіч за паездкі да адваката $250
#4, 25/VI/81, К. Верабей, за настольнікі (у царкоўнай залі) $250
#5, 25/VI/81, А. Міцкевіч за паездкі да адваката $250
#6, 8/VIII/81, А. Міцкевіч, зварот пазыкі $950
——————
$3,700

01) Выдана адвакату 31/X/81, $150.
02) Падарунак Ул. Мікалаю, $400.
——————
$550.

(падпісана) *А. Міцкевіч*

ЗАЎВАГА: Настольнікі ўспомненыя ў пункце #4 гэта няўмела склееныя цыраты якія былі ахвяраваныя царкве. Новыя добрыя настольнікі можна было купіць за $80.

Іньшыя пераданыя дакуманты паказваюць, што за паездкі да адваката/Ню Брансвік/ таксама было выплачана $139 Ул. Русаку й што поўная сума выплачаная адшчэпнікамі адвакату ёсьць $4,669.73.

Падсумоўваючы паездкі да адваката, мы бачым, што адшчэпнікі выплацілі сабе (за паездкі да адваката) $639. Пасьля дакладнейшай праверкі дакумантаў магчыма трэба будзе павялічыць вышэй-паданыя цыфры.

Місійная Багаслужба на Нядзелю Праваслаўя

У нядзелю 7-га сакавіка ў Катэдральным Саборы Сьв. Уладзіміра ў Кліўленд, была адпраўлена ўрачыстая Саборная Вячэрня Беларускім, Украінскім і Сэрбскім духавенствам. ПадобныБагаслужбы ўжо на працягу некалькіх год адбываюцца ў Нядзелю Перамогі Праваслаўя ў Кліўлендзе.

Сьвята на Нядзелю Праваслаўя пастаноўлена адзначаць у палове IX-га стагодзьдзя ў першую нядзелю Вялікага Посту, калі яшчэ ня было падзелу хрысьціянскае царквы на Ўсходнюю й Заходнюю. Устанаўленьне гэтага сьвята моцна зьвязана з папярэдняй гісторыяй хрысьціянскае царквы. Акалічнасьць, якая служыла падставай да ўстанаўленьня сьвята, была тою, што ўжо ў першых стагодзьдзях хрысьціянскае эры сярод хрысьціянаў зьявіліся „ерацікі" якія імкнуліся сваім абмяжаваным розумам ўсё зразумець, усё высьніць і спраўдзіць таямнічасьць Хрыстовае Навукі, а чаго не разумелі, то й пачалі адкрыта супярэчыць Сьв. Эвангельлю й апостальскім пасланьням, а ў выніку чаго паўсталі ў хрысьціянскіх грамадах нялады, закалоты й ненавісьць аднаго на другога, што можна заўважыць і ў сучаснасьці сярод хрысьціянаў на эміграцыі.

Супрацьставіцца тым „ерасям" змушаны былі пастыры й настаўнікі царквы, якія зьбіралі Царкоўныя Саборы, на якіх і асуджвалася ерацкая дзейнасьць і адлучэньне іх ад царквы. Асабліва цяжка прыходзілася змагацца царкве калі ерацкую дзейнасьць падтрымлівалі Імпэратары. Змаганьне з іканаборцамі прадаўжалася на працягу 8-га й 9-га стагодзьдзяў, аж да таго часу, калі Бізынтыйскім Імпэратарам стаўся малалетні Міхаіл III, а дзяржаваю кіравала царыца Тадора і ў 843 годзе ў Канстантынопалі быў скліканы Сабор на якім было адноўлена шанаваньне Іконаў і ўстаноўлена Сьвята Перамогі Праваслаўя ды вызначаны дзень для сьвяткаваньня ў Першую Нядзелю Вялікага Посту. Пасьля прыняцьця хрысьціянства, гэты абрад быў пераняты й нашымі продкамі. Таму й мы кожны год, насьлядуючы традыцыі нашых продкаў, урачыста сьвяткуем Дзень Праваслаўя.

У гэтым годзе ў Кліўлендзе, Саборная Вячэрня распачалася а гадзіне 4-й папаўдні. Ачоліў Багаслужбу Мітрапаліт Андрэй Першагерарх Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы ў асысце Настаяцеля Катэдральнага Сабору сьв. Ўладзімера, Протапрасьвіцера а. Сьцяпана Ганкевіча, Настаяцеля парафіі сьв. Тройцы Протапрасьвіцера а. Іоана, Настаяцеля парафіі сьв. Мікалая ў Лорэне Пратаярэя Міхаіла, Настаяцеля Сэрбскае парафіі ў Барбэртон Протапрасьвіцера Аляксандра й дыякана Мікалая.

Вельмі прыгожа сьпяваў катэдральны хор пад дырыгенствам знаўцы царкоўнае музыкі.

Зьмястоўную пропаведзь на тэму пастановы сьв. Айцоў на Саборы аб шанаваньні Іконаў і перамогі над „ерацікамі" прачытаў Пратаярэй а. Міхаіл. Сынодыкан (або зьмест пастановы Сабору) у якім гаворыцца пра тое, як пасьля доўгіх гадоў ганьбаваньня й нішчэньня Іконаў і аб прызнаньне Саборам сьв. Айцоў шанаваць і „пачытаць" Іконы – прачытаў Мітрапаліт Андрэй. Іконы былі паложаны на аналоі каб пасьля отпуску Вячэрні прысутныя вернікі са скрухаю й пашанаю маглі пакланіцца сьвятым Іконам.

Многалецьце для Першагерархаў Мітрапаліта Мсьціслава, Мітрапаліта Андрэя й Япіскапа Ірынея ды для ўсяго духавенства, рэгента, харыстаў і ўсяго Беларускага, Украінскага й Сэрбскага Народаў – выгаласіў дыякан Мікола. Настаяцнль парафіі Пратапрасьвіцер а. Сьцяпан і Мітрапаліт Андрэй сардэчна падзякавалі прысутнаму духавенству, рэгенту, харыстам і ўсім прысутным за ўдзел у Багаслужбе, жадаючы каб у добрым здароўі й радасьці дачакацца ў наступным годзе Ўрачыстага Сьвята, і перажыўшы час посту радасна спаткаць Уваскрасеньне Хрыстовае.

Настаяцелям парафіі ўсё духавенства было запрошана на пачастунак у дом Настаяцеля, а ўсе прысутныя на перакус ку прыгатаваную Сястрыцтвам у царкоўнай залі.

У часе вячэры адбылася прыязная гутарка паміж духавенствам ня толькі на рэлігійныя, але й на грамадзкія тэмы.

На месцы тут належыць адзначыць, што згодна дамоўленасьці Вячэрня павінна была адбыцца ў Саборы парафіі Жыровіцкае Божае Маці, аднак з прычынаў нявыясьненых ці сьведамае правакацыі за некалькі дзён перад вызначаным часам, ад кіраўніцтва парафіі Жыровіцкае Божае Маці надыйшло паведамленьне, што Вячэрня Перамогі Праваслаўя ў іхняй царкве ня можа адбыцца. Аднак гэта не спрычынілася да неўшанаваньня сьв. Іконаў. Урачыстая Саборная Багаслужба адбылася згодна ўсіх царкоўных правілаў і пакінула добрае ўражаньне сярод прысутных.

РЭДАКЦЫЯ ПАВЕДАМЛЯЕ сваіх чытачоў, што фатаграфіі з візытацыі Ўладыкі Ізяслава ў Кангрэсе ЗША на 25-га Сакавіка спазьніліся й будуць друкавацца ў наступным нумары *ЧАСу*.

Парафіяльны Перавыбарчы Сход у Брукліне

21-га лютага 1982 г. адбыўся перавыбарчы сход Парафіі Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне – першы агульны сход пасьля заканчэньня закалотаў у парафіі ў мінулым жнівені. Кадэнцыя уступаючай парафіяльнай рады ўключала 8-мі месячны перыяд закалотаў і зразумела, што справаздачы, асабліва Старшыні Парафіяльнае Рады Сп. У. Курылы, закранапі гэты закалот. Фінансавая справаздача якую таксама прачытаў Сп. У. Курыла паказала, што для сваіх патрэбаў парафія знаходзіцца на моцным фінансавым грунце. Справаздачу Сястрыцтва прачытала Сп-ня. З. Гарошка, Старшыня Сястрыцтва, у якой падкрэсьліла добрае фінансавае становішча Сястрыцтва і зазначыла, што ў 1981 г. споўнілася 10 гадоў існаваньня Сястрыцтва ў парафіі і што юбілейны артыкул пра Сястрыцтва друкаваўся ў „Царкоўным Пасланцы", №1/10 за сьнежань 1981 г.

Пасьля ўдзяленьня абсалюторыюм з падзякай уступаючай парафіяльнай радзе была выбраная новая парафіяльная рада ў складзе: У. Курыла, старшыня; Р. Гарошка, заступнік старшыні; А. Нэстар, Б. Данілюк і М. Міцкевіч, сябры. У рэвізыйную камісію ўвайшлі П. Маньку́скі, В. Гарошка й Сп-ня. З. Гарошка.

Таксама была выбраная спэцыяльная камісія ў складзе Б. Данілюка, П. Маньку́скага й А. Нэстара для праверкі атрыманых папераў, кнігаў і касы ад групы А. Міцкевіча якая прагарала суд.

Дыктатура Пралетарыяту ў БАПЦ

У БАПЦ, якая кіруецца Першагерархам Мітрапалітам Андрэям, у апошнім часе паўстала пралетарская сыстэма абаснаваная на прынцыпах Марксізму-Ленінізму згодна якой „саветы" кіруюць ня толькі царкоўнай маёмасьцяй, але й духавенствам — назначаюць і звальняюць сьвятароў, выбіраюць япіскапаў, рашаюць па якіх законах і канонах і калі адбудуцца Багаслужбы й хто іх можа адпраўляць.

ПРЫКЛАДЫ

(1) „Савет" парафіі Жыровіцкай Божай Маці ў Гайлянд Парк, Ню Джэрзі, не паслухаў распараджаньня Мітрапаліта Андрэя аб звальненьні быўшага сьвятара Аляксандра Яноўскага й не дапусьціў а. Яна Бруцкага да пераняцьця парафіі як настаяцель. Цяпер гэту справу разглядае сьвецкі суд.

(2) Пятага ліпеня 1980 г. „савет старшыняў" сабраўся ў Кліўлендзе, правёў пастанову пакінуць Яноўскага сьвятаром у Гайлянд Парку, зьліквідаваць суд і ў выпадку нявыкананьня гэтых дамаганьняў Мітрапалітам Андрэям, гразіў яму што „будуць прыняты больш станоўчыя меры."

(3) У Ню Ёрку „савет" пад кіраўніцтвам А. Міцкевіча пастанавіў не прызнаць Уладыкі Ізяслава й самавольна рашыў адлучыцца ад Амэрыканскае Епархіі БАПЦ якою кіруе Мітрапаліт Андрэй, але вярхоўны суд забараніў гэтае адлучэньне й рашыў, што ў БАПЦ жаданьні парафіянаў ня маюць ніякага значаньня ў царкоўным кіраўніцтве.

(4) Чацьвертага верасьня 1981 году „савет" у Гайлянд Парк, Ню Джэрзі, паведаміў Мітрапаліта, што ён („савет") не прызнае пастановы Сабору Япіскапаў БАПЦ, не прызнае Япіскапа Ізяслава й адлучаецца ад Мітрапаліта Андрэя (пераходзіць да Архіяпіскапа Мікалая).

(5) Як падае газэта *Беларускі Голас* за кастрычнік 1981 г.: „30-га жніўня ... Калоша разам з ... Стрэчанем, уварваліся ў Алтар Царквы БАПЦ у Кліўлендзе й пагражаючы Мітрапаліту Андрэю — Першагерарху БАПЦ, загадалі ... Уладыку выйсьці, бо яны забараняюць яму адпраўляць Богаслужбу і што яны вызначаюць служыць Міхася Страпка ..."

(6) 25-га кастрычніка 1981 г. „савет" у Таронта, Канада, недапусьціў да царквы Уладыку Ізяслава.

(7) 14-га сьнежня 1981 г. пралетарскі „савет" выслаў пратэст супраць хіратоніі Ул. Ізяслава да ўкраінскага Мітрапаліта Мсьціслава (пратэст друкуецца асобна паангельску) у якім гэты „савет" вучыць Мітрапаліта законаў, канонаў і кананічнасьці.

(8) 14-га лютага 1982 г. адзін з кіраўнікоў пралетарыяту ў Англіі паведаміў настаяцеля БАПЦ ў Англіі каб ён больш не прыяжджаў у Лёндан на Багаслужбы.

(9) Сёмага сакавіка 1982 г. „савет" у Кліўлендзе забараніў Мітрапаліту Андрэю, Украінскаму й Сэрбскаму духавенству супольна адслужыць Вячэрню на Нядзелю Праваслаўя ў беларускай царкве ў Кліўлендзе.

* * *

